**23- ЛЮТАГА -- ДЗЕНЬ АБАРОНЦАЎ АЙЧЫНЫ.**

**ГОРАЧА ВІНШУЕМ ІХ СА ЗНАМЯНАЛЬНАЙ ДАТАЙ**

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі ўніверсітэт



| № 3(904) | ЧАЦВЕР, 22 ЛЮТАГА 1996 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная |
|---|---|---|---|---|

## ЗАКЛЮЧАНЫ КАЛЕКТЫЎНЫ ДАГАВОР І ПАГАДНЕННЕ

13 лютага адбылася сумесная прафсаюзная канферэнцыя супрацоўнікаў і студэнтаў. На ёй выступіў рэктар акадэмік Беларускай акадэміі адукацыі, член-карэспандэнт АН Беларусі Л.А.Шамяткоў. Ён ахарактарызаваў цяперашняе становішча універсітэта, сказаў аб некаторых выніках дзейнасці за мінулы год, падзяліўся ўражаннямі ад нарады рэктараў дзяржаўных і недзяржаўных вышэйшых навучальных устаноў краіны, якая адбылася ў Раўбічах у пачатку бягучага месяца.

Старшыня прафкома Г.І.Варатніцкі зачытаў праект калектыўнага дагавора паміж прафсаюзнай арганізацыяй супрацоўнікаў і адміністрацыяй, які пасля абмеркавання быў зацверджаны (публікуецца ў сённяшнім нумары газеты).

Старшыня прафкома студэнтаў Н.І.Колтышава зачытала пагадненне паміж прафсаюзнай арганізацыяй студэнтаў і рэктаратам па сацыяльна-эканамічных пытаннях, якія таксама быў зацверджаны (будзе апублікаваны ў наступным нумары нашай газеты).

Замест выбыўшага члена прафкома ад супрацоўнікаў трох кафедр замежных моў універсітэта членам прафкома выбрана выкладчыца кафедры англійскай мовы Т.А.Кузняцова.

### СЁННЯ Ў НУМАРЫ:


- 1 Навіны універсітэцкага жыцця.
- 2-3 Пра мінулы год ГДУ. Да дня абаронцаў Айчыны.
- 4-5 Калектыўны дагавор.
- 6 Памяці народнага пісьменніка.
- 7 Хутка міжнародны фестываль. Для вас, дачнікі.
- 8 Як праходзіць спартакіяда "Здароўе".


## ПЕРАМОЖЦА СОРАСАЎСКАГА КОНКУРСУ

Беларускі Фонд Сораса правёў конкурс аспірантаў і кандыдатаў навук ва ўзросце да 35 гадоў на лепшую публікацыю па рашэнню актуальных праблем у асноўных галінах фундаментальнай навукі -- фізіцы, хіміі, матэматыцы, біялогіі. Адным з яго пераможцаў стаў выпускнік аспірантуры кафедры оптыкі нашага універсітэта Яўген Старадубцаў. У сааўтарстве са сваім навуковым кіраўніком кандыдатам фізіка-матэматычных навук Г.С.Міцюрычам ён апублікаваў у часопісе "Крышталеграфія" артыкул "Фотаакустычная спектраскапія кароткаперыядных звышрашотак", які атрымаў у членаў журы высокую ацэнку.

Я.Старадубцаву, які ў хуткім часе будзе абараняць кандыдацкую дысертацыю, прысуджаны сорасаўскі грант пераможцы конкурсу і адпаведная прэмія.

## ПРАВІЛЫ ТРЭБА ЗАХОЎВАЦЬ

На пасяджэнні прафкома універсітэта абмеркавана пытанне аб стане тэхнікі бяспекі і аховы працы на біялагічным і фізічным факультэтах. Вучэбны корпус N1, дзе займаюцца будучыя біёлагі, філолагі, студэнты факультэта фізічнай культуры, а таксама завочнікі, яўна перагружаны і даўно патрабуе рамонту. Гэта адмоўна адбіваецца і на ўмовах работы калектыву біяфака.

Камісія па ТБ і ахове працы прафкома правярала работу па падтрыманні на біяфаку ў належным стане тэхнікі бяспекі. Было выяўлена шмат недахопаў, на ўхіленне адводзіўся пэўны тэрмін. Кіраўніцтва факультэта, асобы, адказныя за захаванне правілаў ТБ, зрабілі адпаведныя вывады і многія недахопы былі ліквідаваны. Аб гэтым гаварылі выступіўшыя на пасяджэнні прафкома дэкан біяфака С.Ф.Алешка і інжынер па ТБ і ахове працы універсітэта А.В.Яўстраценка. Аднак з-за адсутнасці фінансавых сродкаў пакуль марудна вырашаюцца такія праблемы, як набыццё спецвопраткі і мыйных сродкаў, медыкаментаў для аптэчак і інш. На факультэце шукаюць выйсце са становішча -- немалыя спадзяванні ўскладваюць на створаны тут спонсарскі савет, па магчымасці выдзяляе на гэтыя мэты грашовыя сродкі і прафком універсітэта.

Дала свае станоўчыя вынікі праведзеная аналагічная праверка і на фізічным факультэце. Азначана, што пасля яе тут былі абноўлены інструкцыі па ТБ, у лабараторыях з"явіліся неабходныя надпісы на электрычных разетках, заведзены журналы інструктажу. Аднак застаецца пакуль не ў належным парадку вентыляцыя ў некаторых праблемных лабараторыях факультэта.

## УВАГА: КОНКУРС!

Ва універсітэце аб"яўляецца конкурс 1996 года на лепшыя навукова-даследчыя работы прафесарска-выкладчыцкага і навуковага саставу, выкананыя за апошнія 2-3 гады.

Пераможцы конкурсу выступяць з навуковымі дакладамі на штогадовых Скарынаўскіх навуковых чытаннях, ім будзе прысвоена званне лаўрэатаў Скарынаўскіх чытанняў.

Даведкі па тэл. 56-73-38, інфармацыйная служба НДС, корп. № 5, ауд. 5-14.

# 1995 ГОД: ЯГО АСНОЎНЫЯ ВЫНІКІ

**Як паведамлялася ў папярэднім нумары нашай газеты, на студзеньскім пасяджэнні савета універсітэта па дакладу рэктара акадэміка Беларускай акадэміі адукацыі, члена-карэспандэнта АН Беларусі Л.А.Шамяткова былі абмеркаваны асноўныя напрамкі дзейнасці ГДУ за 1995 год.**

**Сёння ўвазе чытачоў мы прапануем у ізлажэнні даклад Л.А.Шамяткова.**

Падрыхтоўка спецыялістаў у нашым універсітэце, зазначыў на пачатку дакладчык, ажыццяўляецца па дзвюх формах навучання -- дзённай і завочнай -- на дзесяці факультэтах, уключаючы факультэт давузаўскай падрыхтоўкі.

Кантынгент студэнтаў дзённай формы навучання на I студзеня 1996 г. -- 4308 чалавек, сярод якіх 58 - замежныя грамадзяне. Студэнты дзённай формы навучаюцца па 30 спецыяльнасцях. Па шасці з іх набор спынены і па іх працягваюць вучобу толькі студэнты папярэдніх набораў. Летась упершыню ажыццёўлены набор на спецыяльнасці "Эканамічная інфарматыка" дзённай формы навучання і "Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі" -- завочнай.

Цяпер ва універсітэце 46 кафедр. Дзве з іх адкрыты ў 1995 г. -- французкай мовы; тэорыі і гісторыі дзяржавы і права.

З верасня мінулага года падрыхтоўка спецыялістаў па спецыяльнасцях "Эканоміка і кіраванне вытворчасцю", "Бухулік, кантроль і аўдыт", "Эканамічная інфарматыка", "Геалогія і разведка карысных выкапняў", "Гісторыя", "Правазнаўства", "Геаграфія", "Фізіка", "АСАІ" ажыццяўляецца па новых вучэбных планах. Па першых чатырох пералічаных спецыяльнасцях ва універсітэце распрацаваны індывідуальныя вучэбныя планы, якія зацверджаны Міністэрствам адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь.

У бягучым навучальным годзе 55 студэнтаў займаюцца па індывідуальных планах, у тым ліку на факультэце фізічнай культуры -- 34, гісторыка-юрыдычным факультэце -- 12, матэматычным і фізічным -- па 3, геолага-геаграфічным -- 2, біялагічным -- 1.

За папярэдні навучальны год выбыла 305 студэнтаў дзённай формы навучання. За непаспяховасць адлічана 96 чалавек, на завочны факультэт перайшло 115 студэнтаў. За гэты ж перыяд ва універсітэт прыбыло 107 чалавек, у тым ліку з завочнага факультэта на стацыянар перавялося 26 чалавек.

У чэрвені 1995 года па дзённай форме навучання выпушчана 699 спецыялістаў, сярод якіх 12 замежных грамадзян, па завочнай -- 459.

Закончылі універсітэт і атрымалі дыпломы з адзнакай 70 выпускнікоў дзённай формы навучання і 3 -- завочнага факультэта.

Далей Л.А.Шамяткоў гаварыў аб выніках веснавой экзаменацыйнай сесіі мінулага навучальнага года. Абсалютны працэнт паспяховасці -- 81,7. Самым высокім ён быў на біяфаку -- 94,5, самым нізкім -- на факультэце фізічнай культуры: 54,9. 92 студэнты (28%) факультэта фізічнай культуры без уважлівых прычын не ўдзельнічалі ў веснавой пераваднoй сесіі, а 40 чалавек атрымалі нездавальняючыя адзнакі.

Па выніках веснавой экзаменацыйнай сесіі 379 студэнтаў здалі сесію на "выдатна", 148 -- толькі на "здавальняюча", 339 -- атрымалі "двойкі" (у асноўным гэта студэнты малодшых курсаў), 258 -- не з"явіліся на экзамены без уважлівых прычын.

Па выніках сесіі імяннымі стыпендыятамі сталі 9 студэнтаў: 3 -- з матэматычнага факультэта, 2 -- з фізічнага, па аднаму з эканомфака, факультэта фізічнай культуры, філалагічнага, гісторыка-юрыдычнага.

У бягучым навучальным годзе студэнты пераважна эканамічнага і гісторыка-юрыдычнага факультэтаў (спец. "Правазнаўства"), якія добра валодаюць французскай мовай, займаюцца на другім падрыхтоўчым курсе Франка-беларускага інстытута кіравання.

На завочным факультэце ў мінулым годзе навучалася 2600 студэнтаў па 14 спецыяльнасцях. Вучэбны працэс забяспечвала звыш 300 выкладчыкаў. Многія кафедры маюць станоўчы вопыт вучэбна-метадычнай работы са студэнтамі-завочнікамі. Разам з тым асобныя кафедры яшчэ не ўдзяляюць належнай увагі якасці выкладання. Яна застаецца на нізкім узроўні. За мінулы навучальны год на факультэце пераважна за акадэмічную непаспяховасць адлічана звыш 300 студэнтаў. Гэты паказчык у працэнтных адносінах за апошнія гады прыкметна павысіўся. У цэлым па факультэту паспяховасць за апошнія тры гады знізілася на 9% і ў мінулым годзе апусцілася да 63%. Сярод прычын нізкага ўзроўню ведаў -- гэта тое, што частка студэнтаў, якія працуюць па спецыяльнасці, не імкнуцца іх атрымаць, бо іх галоўны клопат -- набыць дыплом аб вышэйшай адукацыі. Аб гэтым сведчаць і вынікі дзяржаўных экзаменаў. Так, па спецыяльнасці "Матэматыка" з 33 выпускнікоў 28 атрымалі здавальняючыя адзнакі і два -- нездавальняючыя. Высокі працэнт здавальняючых адзнак на дзяржэкзаменах быў у выпускнікоў спецыяльнасцей "Геаграфія" (63%), "Беларуская мова і літаратура" (58,8%).

У сваім дакладзе Л.А.Шамяткоў ахарактарызаваў вынікі работы навукова-даследчага сектара. Навуковыя даследаванні па дзяржбюджэтнай і гаспдагаворнай тэматыках праводзіліся па 61 тэме з агульным аб"ёмам фінансавання 3155,378 млн. руб. Усяго ж па тэматычнаму плану выконвалася 105 НДР. 89 з іх летась былі паспяхова завершаны.

Агульны аб"ём выданняў за справаздачны год склаў звыш 165 друкаваных аркушаў. Было выдадзена 8 кніг, апублікавана 105 артыкулаў, з іх 14 -- у міжнародных выданнях, 255 тэзісаў дакладаў. Выдадзена 2 зборнікі навуковых прац па праблемах алгебры і прыкладной матэматыкі.

У мінулым годзе выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта ўдзельнічалі ў 65 навуковых канферэнцыях, на якіх зроблена імі каля 300 дакладаў.

У мінулым годзе пададзена 9 заявак і атрымана 2 станоўчыя рашэнні аб выдачы патэнтаў на вынаходніцтвы. Упершыню прададзена ліцэнзія на вынаходніцтва, што дазволіць універсітэту атрымаць 15 млн. руб. чыстага прыбытку.

Загадам БелВАКа ў мінулым годзе пры нашым універсітэце адкрыты адзін спецыялізаваны савет па абароне доктарскіх дысертацый і два -- па абароне кандыдацкіх дысертацый. На атрыманне вучонай ступені доктара фізіка-матэматычных навук дысертацыю абараніў дацэнт кафедры алгебры і геаметрыі С.Ф.Каморнікаў. Выкладчыкамі універсітэта ў мінулым годзе абаронена таксама 13 кандыдацкіх дысертацый.

На пачатак гэтага года ва універсітэце навучалася 105 аспірантаў -- 59 па стацыянарнай і 46 -- па завочнай формах. Акрамя таго, праходзяць падрыхтоўку 4 замежныя аспіранты. З 16 выпускнікоў аспірантуры адзін абараніўся ў тэрмін і 9 прадставілі дысертацыі. Трое аспірантаў універсітэта П.Астахаў, І.Марозава, В.Селькін удастоены стыпендыі Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Супрацоўнікі універсітэта прынялі ўдзел у шасці міжнародных канферэнцыях, якія праходзілі ў ЗША, Польшчы і Італіі. У рамках дагавору аб міжнародным навуковым супрацоўніцтве адбыўся абмен дэлегацыямі ГДУ і Інстытута фундаментальных праблем тэхнікі Польскай акадэміі навук.

На навукова-тэхнічных канферэнцыях нашымі студэнтамі зроблена 27 дакладаў, у тым ліку на міжнародных -- 14. Студэнтамі асабіста і ў сааўтарстве апублікавана 45 навуковых прац. Найбольшую актыўнасць праяўляюць выхаванцы біялагічнага і фізічнага факультэтаў.

На I студзеня 1996 года ў штаце універсітэта налічваўся 521 выкладчык. У параўнанні з папярэднім годам іх колькасць не змянілася.

Летась працягвалася амаладжэнне прафесарска-выкладчыцкага саставу. На працу былі прыняты выпускнікі аспірантуры і маладыя спецыялісты на конкурснай аснове.

Вялікую работу па запаўненню вакантных ставак правяла загадчыца кафедры англійскай мовы Л.С.Баннікава. На гэту кафедру было прынята 6 чалавек. Тым не менш на I студзеня г.г. ва універсітэце налічвалася 80 вакансій ППС, якія запаўняюцца ўнутранымі і знешнімі сумяшчальнікамі. На ўказаную дату 167 выкладчыкаў працавалі па сумяшчальніцтву за кошт сродкаў дзяржбюджэту і 30 чалавек -- па сумяшчальніцтву з іншых арганізацый.

У цяперашні час ва універсітэце працуюць 172 чалавекі пенсійнага ўзросту, з іх 60 выкладчыкаў.

У дакладзе Л.А.Шамяткова адзначалася, што значныя сродкі патрэбны для ўтрымання і на капітальны рамонт памяшканняў і збудаванняў універсітэта. На капрамонт летась было патрачана 1720,6 млн.руб. А Міністэрствам адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь на гэтыя мэты з бюджэтных асігнаванняў было выдзелена ўсяго 620 млн. руб.

Недахоп сродкаў давялося пакрываць унутранымі рэзервамі, якія ствараліся за кошт спонсарскіх і іншых паступленняў. Дакладчык гаварыў, пры якіх цяжкасцях з-за недахопу фінансавых сродкаў даводзіцца выконваць усе рамонтныя работы.

Велізарных сум патрабуе эксплуатацыя ўсіх вучэбных карпусоў, інтэрнатаў і іншых збудаванняў. У выніку толькі па камунальных і іншых паслугах за 1995 год утварылася неаплачаная картатэка на суму 1853,09 млн.руб.

Належнае асвятленне ў дакладзе знайшла плённая дзейнасць прафкома супрацоўнікаў і прафкома студэнтаў. Падкрэслены пастаянныя клопаты аб сацыяльнай абароне людзей, іх матэрыяльнай падтрымцы, выкарыстанні ўсіх магчымасцей для аздараўлення і г.д.

У выступленні дакладчыка неаднаразова падкрэслівалася, у якіх складаных і вельмі цяжкіх умовах цяпер знаходзіцца вышэйшая школа Беларусі, у тым ліку і наш універсітэт. І ўсё ж, на яго думку, мінулы год для калектыву ГДУ быў даволі плённым і знамянальным. Адным са сведчанняў таго -- адкрыццё Франка-беларускага інстытута кіравання, пашырэнне міжнароднага навуковага супрацоўніцтва, вырашэнне шматлікіх няпростых задач. Істотным дасягненнем з"яўляецца тое, што па колькасці атрыманых грантаў "Сорасаўскі прафесар", "Сорасаўскі дацэнт" наш універсітэт заняў другое месца сярод усіх ВНУ краіны. Ёсць у нас таксама сорасаўскія аспіранты і студэнты.

Напаследак Л.А.Шамяткоў пажадаў калектыву універсітэта пераадольваць усе крызісныя перашкоды, настойліва рухацца наперад, дасягаць новых рубяжоў у падрыхтоўцы маладых кадраў і развіцці навукі.



*Старонкі гісторыі*

## МАРШАЛ БУДЗЁННЫ Ў ГОМЕЛІ

У 20-я гады на тэрыторыі Гомельшчыны былі расквартыраваны многія злучэнні, у тым ліку і кавалерыйскія дывізіі Першай Коннай арміі, камандуючым якой быў герой грамадзянскай вайны С.М.Будзённы.

С.М.Будзённы рэгулярна наведваў воінскія часці, цікавіўся іх бытам. Так, у красавіку 1922 г. ён наведаў 31 кавалерыйскую брыгаду II Палескай кавалерыйскай дывізіі, якая дыслацыравалася ў Гомелі. Уважліва азнаёміўшыся з жыццём воінаў і іх баявой падрыхтоўкай, палкаводзец выступіў перад байцамі і камандзірамі з дакладам аб міжнародным і ўнутраным становішчы Савецкай Рэспублікі.

С.М.Будзённы сустрэўся з супрацоўнікамі рэдакцыі газеты "Палеская праўда". Журналісты расказалі палкаводцу аб сваёй рабоце, цеснай сувязі з байцамі і камандзірамі воінскіх часцей.

Аб тым, якое важнае значэнне шэфству працоўных над воінскімі часцямі надаваў С.М.Будзённы, сведчыць і яго ліст на імя старшыні Гомельскага губвыканкома ад 11 лістапада 1923 года: "Мною атрымана паведамленне аб тым, што Вамі прынята шэфства над 6-й Чангарскай кавдывізіяй -- адной са славутых часцей I-й Конарміі. Выказваю ўсяму Выканкому глыбокую ўдзячнасць і спадзяюся, што славутыя чангарцы адзначаць і апраўдаюць Вашы клопаты".

Палкаводзец неаднаразова бываў на Гомельшчыне. 24 чэрвеня 1924 г. "Палеская праўда" паведамляла: "21 чэрвеня ў 7 гадзін вечара ў Гомель прыбыў член Рэўваенсавета СССР і інспектар кавалерыі С.М.Будзённы. 23 чэрвеня на аэрадроме адбыўся парад часцей, размешчаных у Гомелі..." Газета расказала аб сустрэчы байцоў адной з воінскіх часцей з легендарным героем грамадзянскай вайны. Будзённы наведаў Гомельскі конзавод, аглядзеў коней, гутарыў з рабочымі і адміністрацыяй. Ён прыняў удзел у пасяджэнні прэзідыума Гомельскага губвыканкома, на якім разглядаліся пытанні, звязаныя з дыслакацыяй воінскіх часцей на Гомельшчыне.

Як сведчаць дакументы архіва, наведаў Будзённы наш горад і 30 лістапада 1926 года. Тады ён прыбыў на святкаванне 7-й гадавіны Чангарскай дывізіі, якая была расквартыравана ў Гомелі.

Кожны прыезд славутага героя грамадзянскай вайны быў вялікай падзеяй для гамяльчан.

**В.ЛУГАЎСКАЯ,**
**заг. аддзела Дзяржаўнага архіва Гомельскай вобласці.**

# КАЛЕКТЫЎНЫ ДАГАВОР

## прафсаюзнага камітэта і адміністрацыі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны на 1996-1997 гады.

### I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ.

1.1. Сапраўдны калектыўны дагавор з"яўляецца нарматыўным актам, які рэгулюе працоўныя і сацыяльна-эканамічныя адносіны паміж адміністрацыяй ГДУ і работнікамі ўсіх катэгорый універсітэта.

Прафсаюзная арганізацыя аб"ядноўвае 1140 работнікаў універсітэта і прафком з"яўляецца паўнамоцным прадстаўніком працоўнага калектыву.

1.2. Калектыўны дагавор заключаецца ў пісьмовай форме на два гады на падставе Закона Рэспублікі Беларусь "Аб калектыўных дагаворах і пагадненнях" і "Пагадненне паміж Міністэрствам адукацыі і навукі і Рэспубліканскім камітэтам прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі", якое ўключае ў сябе:

-- абарону сацыяльна-эканамічных інтарэсаў работнікаў;

-- раўнапраўе бакоў;

-- улік рэальных магчымасцей матэрыяльнага, вытворчага і фінансавага забеспячэння прымаемых абавязацельстваў.

1.3. Калектыўны дагавор уступае ў сілу з моманту яго падпісання і дзейнічае да заключэння новага. Адміністрацыя абавязана азнаёміць усіх работнікаў, у тым ліку ўпершыню прынятых, з дзейнічаючым калектыўным дагаворам, для чаго размножыць яго і ў месячны тэрмін забяспечыць ім структурныя падраздзяленні і службы універсітэта.

**Адк. рэктарат.**

1.4. Змяненні і дапаўненні калектыўнага дагавора пры згодзе бакоў уносяцца на працягу яго тэрміну дзеяння на савеце універсітэта сумесна з прафкомам.

1.5. Вядзенне перамоў на раўнапраўнай аснове, падрыхтоўку і кантроль за выкананнем калектыўнага дагавора ажыццяўляе камісія ўпаўнаважаных прадстаўнікоў адміністрацыі і прафкома па тры чалавекі з кожнага боку.

**Адк. рэктарат, прафком.**

1.6. Адміністрацыя і прафком забяспечваюць нясыпнны кантроль выканання ўмоў калектыўнага дагавора.

Бакі абавязуюцца кожнае паўгоддзе разглядаць ход выканання калектыўнага дагавора на сумесным пасяджэнні рэктарата і прафкома і аб выніках інфармаваць калектыў праз газету "Гомельскі універсітэт".

**Адк. рэктарат, прафком, Балога У.П.**

1.7. Рэктарат пасля падпісання калектыўнага дагавора ў двухтыднёвы тэрмін выдае загад аб арганізацыі выканання мерапрыемстваў, якія ўваходзяць у яго абавязацельствы.

**Адк. рэктарат.**

1.8. У тыднёвы тэрмін разглядаць прадстаўленні прафкома аб маючых месца недахопах у выкананні дагавора, прымаць меры дысцыплінарнай і матэрыяльнай адказнасці да вінаватых асоб і інфармаваць прафком на яго бліжэйшым пасяджэнні.

**Адк. рэктарат.**

1.9. Калектыўны дагавор падпісваецца рэктарам і старшынёй прафкома.

### РАЗДЗЕЛ II
### АРГАНІЗАЦЫЯ ПРАЦЫ, НАРМІРАВАННЕ.

2.1. Адміністрацыя універсітэта абавязуецца ажыццяўляць раўнамерную нагрузку выкладчыкаў па семестрах, не дапускаць больш шасці аўдыторных гадзін па асноўнай рабоце і дзевяці гадзін -- з улікам сумяшчальніцтва, правядзення больш аднаго экзамена ў дзень. Працу ў выхадныя дні дапускаць у выключных выпадках, афармляючы ў адпаведнасці КЗаП Рэспублікі Беларусь.

**Адк. Папкова Н.І., заг. кафедры, пастаянна.**

2.2. У мэтах паляпшэння ўмоў працы, санітарна-гігіенічнага стану памяшкання, вучобы студэнтаў, рацыянальнага выкарыстання матэрыяльна-тэхнічнай базы замацаваць загадам па універсітэту аўдыторны фонд за факультэтамі і адпаведнымі структурнымі падраздзяленнямі з улікам аб"ёму і відаў вучэбнай нагрузкі.

**Адк. Папкова Н.І., дэканы факультэтаў, да 15.03.96.**

2.3. Сярэдні аб"ём вучэбнай нагрузкі выкладчыкам на наступны навучальны год устанаўліваць з улікам агульнай колькасці вучэбнай нагрузкі па універсітэту і пагадзіннага фонду, зацверджанага Міністэрствам адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь.

**Адк. Пашук С.Я., Папкова Н.І., на працягу года.**

2.4. Дазволіць штатным супрацоўнікам ГДУ, па рашэнні кафедр, выкананне пагадзіннай вучэбнай нагрузкі да 0,5 штатнай вучэбнай нагрузкі.

**Адк. Кармазін А.П., Папкова Н.І., на працягу года.**

2.5. Забяспечыць выкананне ўстаноўленага парадку і дысцыпліны ўсімі выкладчыкамі і супрацоўнікамі. Адзін раз у месяц праводзіць выбарачную праверку захавання дысцыпліны ў структурных падраздзяленнях з апублікаваннем яе вынікаў.

**Адк. аддзел кадраў, прафком.**

2.6. Да кожнага супрацоўніка пад распіску давесці яго службовыя функцыянальныя абавязкі.

**Адк. кіраўнікі падраздзяленняў, да 01.03.96 г.**

2.7. У рабочы час забараніць выкарыстанне рабочых і служачых на іншых, не звязаных з іх працоўнымі абавязкамі, работах.

**Адк. рэктарат, прафком, на працягу года.**

### РАЗДЗЕЛ III
### АПЛАТА ПРАЦЫ.

3.1. Адміністрацыя універсітэта, прафком абавязуюцца адстойваць існуючую рэдакцыю абзаца 7 арт. 34 Закона "Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь".

**Адк. Шамяткоў Л.А., Варатніцкі Г.І.**

3.2. Аплату працы выкладчыкаў, супрацоўнікаў, усіх служачых і работнікаў праводзіць у адпаведнасці з зацверджанымі акладамі і тарыфамі па дзеючаму заканадаўству. Выплату заработнай платы пры своечасовым фінансаванні ажыццяўляць: аванс і пагадзінную аплату -- з 18 чысла, разлік за месяц --з 3 чысла наступнага месяца.

**Адк. Курава І.А., Пашук С.Я.**

3.3. Выдачу разліковых лісткоў ажыццяўляць па ўсіх відах заработнай платы.

**Адк. Курава І.А.**

3.4. У межах сродкаў, выдзяляемых на аплату працы, прадугледзець да 10% планавага фонду заработнай платы штатных работнікаў на прэміраванне і ўстанаўленне надбавак за высокія творчыя і вытворчыя дасягненні, за выкананне асабліва важных (тэрміновых) работ на тэрмін іх правядзення штатнымі работнікамі ў памеры да 50% пасадавага аклада.

Надбаўкі, прэміі, матэрыяльная дапамога вызваленым прафсаюзным работнікам робяцца на агульных умовах з членамі працоўнага калектыву.

Паказчык, умовы і памеры прэмій работнікам вызначаюцца палажэннем аб прэміраванні, зацверджаным рэктарам і ўзгодненым з прафкомам і максімальнымі памерамі не абмяжоўваюцца.

**Адк. Шамяткоў Л.А., Курава І.А., Пашук С.Я., на працягу года.**

3.5. У межах сродкаў, прадугледжаных каштарысам даходаў і расходаў па бюджэту, прадугледзець да 5% планавага фонду заработнай платы штатных работнікаў на аказанне матэрыяльнай дапамогі супрацоўнікам універсітэта.

**Адк. Шамяткоў Л.А., Курава І.А., Пашук С.Я., на працягу года.**



3.6. Устанавіць даплаты рабочым, спецыялістам і служачым універсітэта за сумяшчэнне прафесій (пасад), пашырэнне зон абслугоўвання або павелічэнне аб"ёму выконваемых работ. Даплаты спецыялістам і служачым устанаўліваюцца ў памеры да 30% аклада па сумяшчальнай пасадзе, а рабочым -- да 70% тарыфнай стаўкі (аклада) па сумяшчальнай пасадзе.

**Адк. Селькін М.В., Курава І.А., Пашук С.Я., на працягу года.**

3.7. Устанавіць даплаты рабочым, спецыялістам і служачым за выкананне разам са сваёй асноўнай работай абавязкаў часова адсутнічаючага работніка. Даплаты ўводзяцца ў межах тарыфнай стаўкі (аклада) адсутнічаючага работніка, зыходзячы з фактычна выконваемага за яго аб"ему работы.

**Адк. Селькін М.В., Курава І.А., Пашук С.Я., на працягу года.**

3.8. Устанавіць даплаты работнікам, занятым на работах з неспрыяльнымі ўмовамі працы, у памеры 0,26 -- 0,58% месячнай мінімальнай заработнай платы за кожную гадзіну работы ў гэтых умовах з улікам ступені цяжкасці і шкоднасці працы.

**Адк. Селькін М.В., Курава І.А., Пашук С.Я., Яўстраценка А.В., на працягу года.**

3.9. Па прадстаўленню адміністрацыі са сродкаў прафкома прэміраваць у памеры мінімальнай зарплаты кожнага з пяці лепшых членаў дружыны па ахове грамадскага парадку.

**Адк. Варатніцкі Г.І., раз у год.**

3.10. Забяспечыць шырокую галоснасць мерапрыемстваў па заахвочванню, выплаце прэмій і дысцыплінарнага ўздзеяння да супрацоўнікаў усіх катэгорый і структур ГДУ.

**Адк. кіраўнікі структурных падраздзяленняў, прафгрупоргі, рэдакцыя газеты, на працягу года.**

3.11. Прасіць аблвыканком прыняць пастанову аб выдзяленні жылля высокакваліфікаваным супрацоўнікам універсітэта за кошт сродкаў, прадугледжаных на ліквідацыю катастрофы на ЧАЭС.

**Адк. рэктарат, прафком.**

### РАЗДЗЕЛ IV
### ЗАБЕСПЯЧЭННЕ САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЫ.

4.1. Захаваць у адпаведнасці з існуючым палажэннем для прафесарска-выкладчыцкага саставу конкурсны парадак замяшчэння вакантных пасад.

З асобамі пенсійнага ўзросту дазволіць адміністрацыі заключаць працоўныя адносіны шляхам тэрміновых працоўных кантрактаў (дагавораў) на навучальны год толькі са зноў прынятымі на працу.

**Адк. Кармазін А.П., Осіпава Т.І на працягу года.**

4.2. Для прафесарска-выкладчыцкага саставу ўстанаўліваецца 6-гадзінны рабочы дзень пры 6-дзённым рабочым тыдні, у межах якога выкладчыкі павінны весці ўсе віды вучэбна-метадычнай, навукова-даследчай і выхаваўчай работы.

Прадставіць работнікам універсітэта аплачваемыя водпускі ў сувязі: з рэгістрацыяй шлюбу -- 3 дні, сярэбраным вяселлем -- 1 дзень, паступленнем дзіцяці ў першы клас -- 1 дзень.

**Адк. Кармазін А.П., Папкова Н.І.**

4.3. Па ўзгадненню бакоў адміністрацыя можа прадстаўляць работніку водпуск без захавання заработнай платы па сямейных акалічнасцях і іншых прычынах да 14 каляндарных дзён з умовай выкарыстання чарговага водпуску.

**Адк. Осіпава Т.І., кіраўнікі структурных падраздзяленняў.**

4.4. Для супрацоўнікаў навукова-даследчага сектара водпуск без захавання заработнай платы прадстаўляецца да 30 каляндарных дзён з улікам выкарыстання чарговага водпуску.

**Адк. Осіпава Т.І., Міцюрыч Г.С., кіраўнікі структурных падраздзяленняў.**

4.5. Скасаванне працоўнага дагавора па ініцыятыве адміністрацыі праводзіцца: за правінныя дзеянні работніка (прагул без уважлівых прычын, з"яўленне на рабоце ў нецвярозым стане, крадзёж на месцы працы, сістэматычнае невыкананне працоўных абавязкаў, калі раней прымяняліся меры дысцыплінарнага ўздзеяння) пасля папярэдняга паведамлення прафкома, у астатніх выпадках -- з папярэдняй згоды прафсаюзнага камітэта.

**Адк. Кармазін А.П., Варатніцкі Г.І., на працягу года.**

4.6. Адміністрацыя абавязуецца рэгулярна аказваць матэрыяльную дапамогу ветэранам Вялікай Айчыннай вайны па прадстаўленню прафкома і савета ветэранаў з фонду матэрыяльнага заахвочвання універсітэта.

**Адк. рэктарат.**

4.7. Хадайнічаць перад выканкомамі раённага і гарадскога Саветаў дэпутатаў аб стварэнні новых садова-агародных таварыстваў і выдзяленні сельгасучасткаў без права забудовы, а таксама аказваць усямерную дапамогу існуючым сямі таварыствам па іх уладкаванню.

**Адк. рэктарат, прафком.**

4.8. Адміністрацыя абавязваецца па ўзгадненню з прафкомам аказваць матэрыяльную дапамогу выкладчыкам і супрацоўнікам з цяжкімі ўмовамі жыцця, пры смерці выкладчыкаў і супрацоўнікаў, іх бацькоў і дзяцей і пры іншых няшчасных выпадках у межах трох мінімальных зарплат пры наяўнасці сродкаў, выдзеленых на матэрыяльную дапамогу. Прафком абавязуецца выплачваць пры смерці супрацоўніка універсітэта тры мінімальныя зарплаты, родных супрацоўніка --дзве мінімальныя зарплаты.

**Адк. рэктарат, прафком.**

4.9. На падставе арт. 207 КЗаП Рэспублікі Беларусь утварыць з роўнай колькасцю прадстаўнікоў адміністрацыі і прафсаюза камісію па працоўных спрэчках тэрмінам на І год.

**Адк. Кармазін А.П., Варатніцкі Г.І., да 10.03.96 г.**

### РАЗДЗЕЛ V
### КУЛЬТУРНАЯ І СПАРТЫЎНА-МАСАВАЯ РАБОТА, АРГАНІЗАЦЫЯ АДПАЧЫНКУ.

5.1. Прафком і адміністрацыя абавязуюцца наладжваць калектыўны прагляд супрацоўнікамі ў абласным драмтэатры, а для дзяцей -- цыркавых праграм, для дарослых арганізоўваць сумесныя сустрэчы Новага года, 8 Сакавіка, для дзяцей -- навагоднія ранішнікі; па меры магчымасцей выдзяляць сродкі для сумеснага святкавання найбольш знамянальных дат, для ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны праводзіць "агеньчыкі" у гонар Дня Перамогі.

**Адк. прафком, рэктарат.**

5.2. Прафком абавязуецца: аказваць садзейнічанне ў набыцці супрацоўнікам і іх дзецям пуцёвак у санаторыі, дамы і на базы адпачынку, у дзіцячы лагер, для аздараўлення за межамі краіны. Своечасова даводзіць да ведама калектыву аб змяненні парадку выдачы і аплаты пуцёвак у санаторыі і дамы адпачынку. Забяспечыць строгі кантроль за правільным размеркаваннем і выдачай пуцёвак на санаторна-курортнае лячэнне і адпачынак.

**Адк. прафком, рэктарат.**

5.3. Для супрацоўнікаў праводзіць масавыя спаборніцтвы па праграме "Здароўе", для студэнтаў -- круглагадовую спартакіяду.

**Адк. спартклуб.**

### РАЗДЗЕЛ VI
### ПРАВАВЫЯ ГАРАНТЫІ ДЗЕЙНАСЦІ ПРАФСАЮЗНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ.

6.1. Утрымліваць прафсаюзныя ўзносы праз бухгалтэрыю універсітэта. За ўтрыманне прафсаюзных узносаў і пералік іх на рахунак прафкома супрацоўнікам бухгалтэрыі выдаваць грашовыя ўзнагароджанні.

**Адк. прафком, на працягу года.**

**Калектыўны дагавор прыняты на прафсаюзнай канферэнцыі сумесна з рэктаратам 13 лютага 1996 г.**

*З юбілейнага літаратурнага вечара*

# НАШ МЕЛЕЖ

Свой родны куточак, палескі край, мы па праву называем мележаўскім. Гэта ён, Іван Паўлавіч Мележ, наш зямляк, народны пісьменнік Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай і Ленінскай прэмій навучыў нас праз свае творы, і асабліва славутую трылогію "Палеская хроніка", напісаную з усёй глыбінёй не толькі мастацкага таленту, але і таленту чалавечнасці і дабрыні, любіць свой край, мову, культуру. Ён змог па-новаму адкрыць беларусаў -- простых палешукоў-- для народаў свету. І ў дзень 75-годдзя з дня нараджэння нашага пісьменніка-земляка, адаючы даніну глыбокай павагі яго памяці, мы бралі для сябе ўрокі жыцця -- быць такімі ж, як ён, адданымі сваёй Бацькаўшчыне.

Гэта думка падкрэслівалася ў выступленнях выкладчыкаў, студэнтаў нашага універсітэта на юбілейным літаратурным вечары, прысвечаным 75-годдзю І.Мележа. Адкрываючы яго, рэктар член-карэспандэнт АН Беларусі Л.А.Шамяткоў адзначыў, што па добрай і даўняй традыцыі ў сценах ГДУ адбываюцца сустрэчы беларускіх пісьменнікаў і паэтаў са студэнцкай моладдзю. У сваё 50-годдзе тут быў і Іван Паўлавіч Мележ. Сумна ўсведамляць, што яго сёння ўжо няма сярод нас, але сэрца саграває тое, што напісанае ім застанецца назаўсёды.

Шмат самых цёплых, шчырых, пранікнёных слоў пра вялікага майстра і проста выдатнага чалавека было сказана ў выступленнях доктара філалагічных навук загадчыка кафедры беларускай літаратуры І.Ф.Штэйнера, прафесара У.В.Анічэнкі, якому ў першыя пасляваенныя гады давялося слухаць лекцыі Івана Паўлавіча па беларускай літаратуры на філфаку ў БДУ, загадчыка кафедры рускай літаратуры дацэнта У.М.Сабаленкі. З літаратурнай кампазіцыяй, прысвечанай памяці пісьменніка, выступілі чацвёртакурсніцы беларускага аддзялення філалагічнага факультэта Таццяна Варгетава і Юлія Дуброўская, сваімі глыбокімі ўражаннямі аб наведванні радзімы І.Мележа -- в.Глінішчы Хойніцкага раёна, мясцовага музея падзялілася студэнтка філфака Кацярына Хазанава.

З асаблівай цікавасцю слухалі на вечары В.І.Смыкоўскую, дацэнта кафедры беларускай літаратуры. У 1969 годзе ўпершыню пераступіла яна парог кватэры І.Мележа ў Мінску, калі пачынала працу над сваёй кандыдацкай дысертацыяй па творчасці пісьменніка-земляка. Шмат потым было такіх сустрэч, у час якіх перад ёй адкрываўся і вялікі талент творцы, грамадскага дзеяча, і проста добразычлівага, сціплага чалавека. Былі і паездкі на яго радзіму, дзе ёй давялося сустракацца з прататыпамі герояў "Палескай хронікі". Вынікам усіх гэтых сустрэч, усяго ўбачанага і пачутага стала напісаная В.І.Смыкоўскай кніга пра "мастака самай вышэйшай пробы".

Беларуская народная песня жывіла карані таленту Івана Мележа. І менавіта яна стала лагічным працягам выступленняў на юбілейным вечары. У выкананні пляменніцы пісьменніка старшай выкладчыцы кафедры беларускай літаратуры В.С.Генаш і кіраўніка фальклорнага калектыву ГДУ А.Эбзеевай шчыра і пранікнёна гучалі беларускія народныя песні.

Сваё выдатнае выканаўчае майстэрства прадэманстравалі на вечары таксама народная харавая капэла "Дзянніца", фальклорны і танцавальны калектывы клуба самадзейнасці ГДУ.

Нельга было абысці ўвагай выставу малюнкаў вучняў класа "Беларуская філалогія" пры кафедры беларускай мовы. Нібыта сышлі са старонак "Палескай хронікі" яе галоўныя героі, вабілі сваёй сціплай прыгажосцю куточкі нашай роднай прыроды.

Усіх, хто прыйшоў у той вечар у актавую залу універсітэта, аб"яднала агульная думка: высокае харaство мастацтва нашага пісьменніка-земляка ўзвышае і ачышчае чалавечую душу.

**Т.ДУБЯК.**

---

**Час прымусіў многіх з нас стаць дачнікамі, атрымаць кавалак зямлі, каб вырасціць на ім бульбу, гароднiну, садавіну, з дапамогай якіх можна пракарміцца і ўлетку, і на зіму зрабіць нарыхтоўкі. Але не ва ўсіх яшчэ ёсць неабходны вопыт у гэтай справе. Каб атрымаць добры ўраджай, аднаго старання мала, патрэбны і пэўныя веды ў аграгэхніцы. Спадзяемся, што ніжэй змешчаны матэрыял кандыдата сельскагаспадарчых навук В.Верамейчыка дапаможа вам у гэтым.**

## ПАРАДЫ ДАЧНІКАМ

# АГРАТЭХНІКА

Расаду гароднiны для адкрытага грунту вырошчваюць у сакавіку ў розных відах цяпліц, парніках, у пакоі каля акна.

Сеянцы капусты, памідораў, агуркоў, цыбулі, кабачкоў, качаннага салату, сельдэрэя, рэвеню, як правіла, распікіроўваюць (рассаджваюць у торфа-перагнойныя (ганчарныя, папяровыя і інш.) гаршчочкі. Можна абысціся і без пікіроўкі, праводзячы сяўбу калібраванага насення непасрэдна ў расадныя гаршчочкі.

Норма высеву насення для вырошчвання семянцоў: сельдэрэя -- 5 і (без пікіроўкі) 2, капусты -- 12 і 4, перцу -- 10 і 4, памідораў -- 8 і 1, агуркоў -- 10 і 5, качаннага салату -- 5 і 2, цыбулі -- 20 і 12, рэвеню -- 15 і 6 г на адзін квадратны метр.

Прасцейшая пажыўная сумесь для іх вырошчвання складаецца з нізіннага торфу, перагною, дзярновай зямлі і каравяку. Пікіраваць сеянцы можна толькі ў прагрэтыя расадныя гаршчочкі (кубікі, шкляначкі і г.д.). Пачынаюць пікіраваць сеянцы ў фазе добра развітых семядоляў.

Тэмпературны рэжым пры вырошчванні расады ранняй белакачаннай, каляровай капусты, сельдэрэя, цыбулі, качаннага салату, рэвеню наступны: ад пасеву да паяўлення ўсходаў -- плюс 20, пасля паяўлення ўсходаў на працягу 5-7 дзён плюс 6-10. Далей тэмпературу трэба падтрымліваць у сонечныя дні ў межах 16-18, у пахмурныя дні -- 14-16; ноччу -- 8-12 градусаў цяпла. Расаду памідораў, агуркоў, кабачкоў, перцу вырошчваюць пры тэмпературы на 6-8$^0$ вышэй.

Узрост расады (каранастай, з 4-5 добра развітымі лістамі) да высадкі ў полі павінен прыкладна быць: у сельдэрэя -- 60-80 дзён, у цыбулі салодкіх сартоў -- 60-70 дзён, капусты белакачаннай — да 50, перцу і памідораў -- да 60, кабачкоў і агуркоў -- да 30-40 дзён (іх сеюць для адкрытага грунту ў красавіку), качаннага салату -- 30-45, рэвеню -- 90 дзён.

На квадратны метр адкрытага грунту патрабуецца раслін расады сельдэрэя -- 10-14 шт., капусты белакачаннай ранняй і каляровай -- 5-6, капусты сярэднеспелай -- 3, капусты позняй -- 2, памідораў -- 4-5, перцу -- 7-8, агуркоў -- 20-24, кабачкоў -- 1-2, качаннага салату -- 8-11, рэвеню -- 1-2 шт.

З 20 сакавіка можна сеяць пад плёнкай такую зяленую гароднiну як кроп, салата, радыска. Гэта дазволіць значна раней атрымаць першы ўраджай.

Лісце кропу багатае вітамінамі. Зеляніна бывае гатова праз 25-30 дзён ад моманту з"яўлення ўсходаў. Выкарыстоўваючы скараспеласць фарміравання зеляніны кропу, яго можна пасеяць у некалькі тэрмінаў (на адной і той жа або суседняй градцы). Каб усходы з"явіліся хутчэй, насенне кропу пасля намачвання (спачатку 2-3 сутак у звычайнай водаправоднай вадзе, мяняючы праз кожныя 9 гадзін, а затым у цеплай вадзе) і правялівання высяваюць у расадную скрынку (з разліку 3-4 грамы сухога насення) або ў грунт цяпліцы (з разліку 20-25 грам на 1 кв. м), паліваюць зноў цёплай вадой, пакрываюць слоем торфу або перагною таўшчынёй у паўсантыметра, крыху прыкрываюць і ўшчыльняюць. Пасля з"яўлення ўсходаў скрынкі расстаўляюць у адзін рад на святло. За перыяд вегетацыі кроп 2-3 разы паліваюць, сумяшчаючы паліў з падкормкай азотнымі ўгнаеннямі.

Раннія сарты радыскі — самыя скараспелыя з карняплодаў раслін. Яна паспявае праз 30-35 дзён пасля пасеву. Пры пасеве 8 г насення на квадратны метр вясной можна атрымаць больш 3 кг радыскі. Яе можна вырошчваць і ў скрынках. Ураджай праз 30-35 дзён складае не менш 4-5 пучкоў са скрынкі. З сартоў радыскі можна парэкамендаваць для вырошчвання пад плёнкай "Цяплічны", "Зару" і "Ранні чырвоны", якія даюць ураджай да 4 кг з аднаго кв. метра. Трэба мець на ўвазе, што лісце ранняй радыскі -- каштоўны, смачны прадукт.

**В.ВЕРАМЕЙЧЫК,**
**кандыдат сельскагаспадарчых навук, дацэнт кафедры батанікі і фізіялогіі раслін.**



*Арт-сесія-96*

# ПАДРЫХТОЎКА ПАЧАЛАСЯ

1996 год толькі пачаўся, а ўжо ідзе падрыхтоўка да чарговага II Міжнароднага маладзёжнага фестывалю "Арт-сесія", які павінен адбыцца з 24 красавіка па 1 мая 1996 года. Базай для правядзення фестывалю з"яўляецца наш універсітэт, а арганізатарам -- яго культурны цэнтр, узначальваемы А.В.Лысянковым. Ён жа -- дырэктар Міжнароднага маладзёжнага фестывалю.

Мінулагодні фестываль даў моцны штуршок для ажыўлення культурных кантактаў паміж студэнтамі нашага горада і гасцямі з Францыі, Шатландыі, суседніх Украіны і Расіі. Сяброўскія зносіны перад канцэртамі і пасля іх, вечар сяброў і іншыя мерапрыемствы надоўга запамяталіся ўдзельнікам фестывалю, гаспадарам і гасцям з розных краін. Моладзь хутка знаёміцца, завязвае кантакты паміж сабой. І нават моўны бар"ер не перашкода.

Фестываль "Арт-сесія" Гомель-96 абяцае быць яшчэ больш грандыёзным і запамінальным, чым папярэдні. Чакаем прыбыцця дэлегацый з Францыі, Шатландыі, Італіі, Венгрыі, Чэхіі, Індыі, Польшчы, Нарвегіі, Украіны і Расіі. Для ўдзелу ў фестывалі запрошаны шматлікія таленавітыя калектывы, аркестры, хоры, тэатры, асобныя выканаўцы, мастакі, мастакі-мадэльеры. У рамках фестывалю прадугледжаны выступленні не толькі ў зале ГДУ, але і на іншых канцэртных пляцоўках горада: у зале абласнога Дома настаўніка, у абласным драматычным тэатры, канцэртным зале каледжа мастацтваў і на самай буйнай у горадзе канцэртнай пляцоўцы -- у вялікай зале гарадскога грамадска-культурнага цэнтра.

Асноўным крытэрыем адбору калектываў, запрошаных на фестываль у гэтым годзе, быў іх прафесіяналізм. Узровень прафесіяналізму запрошаных гасцей дастаткова высокі нават для такога шырокамаштабнага Міжнароднага форуму моладзі. Зноў запрошаны для ўдзелу фальклорны ансамбль з горада Клермон-Феран (Францыя), фальклорны ансамбль універсітэта Кракава (Польшча), маладзёжны хор з Нарвегіі. Абяцае быць цікавым выступленне тэатра з Індыі, венгерскага ансамбля танца Вышэйшай Акадэміі мастацтваў Будапешта (Венгрыя), харэаграфічны калектыў Цэнтра харэаграфічнага мастацтва Прагі (Чэхія). Парадуюць гледачоў і шматлікія калектывы нашага горада і рэспублікі. "Арт-сесія" абяцае быць яркім, красамоўным і запамінальным відовішчам.

Тое, якім будзе твар фестывалю, у многім залежыць не толькі ад арганізатараў мерапрыемства, але і ад прапаноў патэнцыяльных удзельнікаў і спонсараў. Прафесійныя і аматарскія калектывы, творчыя людзі, спонсары і ўсе жадаючыя дапамагчы ў арганізацыі і правядзенні II Міжнароднага маладзёжнага фестывалю "Арт-сесія" Гомель-96 могуць звязацца з дырэкцыяй па тэл.: 57-11-17, 57-11-15, 57-33-30, факс (0232) 564-289, 578-111. Тое, якім наш горад запамятаецца ў фестывальныя дні замежным гасцям і якое аб нас складзецца меркаванне, тое, якім будзе фестываль у 1996 годзе, залежыць у многім і ад нас з Вамі.

**П.БЕСЯЦКІ.**

# ГАРОДНІНЫ

Плаванне

# ПА ПРАГРАМЕ СПАРТАКІЯДЫ "ЗДАРОЎЕ"

Сама назва універсітэцкай спартакіяды -- "Здароўе" -- красамоўна раскрывае яе сэнс і прызначэнне: садзейнічаць таму, каб выкладчыкі і супрацоўнікі ГДУ адчувалі сябе ў фізічным плане бадзёрымі, моцнымі, аптымістычнымі. Як жа выкарыстоўваюць сёння гэту магчымасць члены універсітэцкага калектыву? Шчыра кажучы, у многіх людзей цяпер страчваецца цікавасць да жыцця з-за невыносных ужо для нярвовай сістэмы матэрыяльных цяжкасцей. "Які яшчэ там спорт будзе ў галаве, калі трэба думаць пра кавалак хлеба" -- такія думкі ў многіх цяпер часта бяруць верх. А дарэмна ігнаруюцца імі прадстаўляемыя магчымасці забыцца пра цяжкасці паўсядзённага жыцця, даць душы хоць на нейкі час скінуць цяжар шэрай будзённасці.

Спаборніцтвы па плаванню, якія праводзіліся нядаўна, яскрава прадэманстравалі абыякавасць большай іх часткі да свайго фізічнага і псіхалагічнага стану. Адсюль і такая невялікая колькасць удзельнікаў. Няма больш, на жаль, у людзей і пачуцця калектывізму, адказнасці, гонару за свой факультэт. Гэту думку з горыччу выказаў галоўны суддзя спаборніцтваў Б.Гіль.

У басейн гарспарткомплексу на першынство па плаванню прыйшлі прадстаўнікі толькі эканамічнага, матэматычнага факультэтаў, факультэта фізічнай культуры, па аднаму чалавеку ад рэктарата, рэдакцыі нашай газеты, службы НТІ. Астатнія факультэты і падраздзяленні іх праігнаравалі.

Такім чынам, на блакітных дарожках у заплыве на 50 м мераліся сіламі 19 чалавек -- 7 жанчын і 12 мужчын. Сярод першых ва ўзроставай групе да 40 гадоў лепшы вынік паказала дацэнт кафедры эканамічнай інфарматыкі і АСК В.Пугачова, у групе старэй за гэты ўзроставы рубеж -- таксама прадстаўніца эканамічнага факультэта лабарантка кафедры эканомікі і кіравання вытворчасцю С.Папкова. Самых лепшых слоў заслугоўвае таксама Э.Лізарава з кафедры эканомікі і сацыялогіі працы, якая, нягледзячы на пенсійны узрост, мужна пераадольвала водную дыстанцыю.

Было відавочна, што на эканомфаку ёсць людзі, якія "хварэюць" за спартыўны прэстыж свайго факультэта і хочуць бачыць яго сярод лідэраў.

У мужчын канкурэнцыя за першае месца была больш вострай. Дастойна вытрымалі выпрабаванне на хуткасць у заплывах асістэнт кафедры эканамічнай інфарматыкі і АСК Д.Дораш (да 40 гадоў), ст. выкладчык кафедры ТМФК В.Марчук (звыш 40 гадоў) і прафесар загадчык кафедры дыфураўненняў У.Міроненка (звыш 50 гадоў).

Пераможцы атрымалі прызы ад прафкома універсітэта.

**Т.ДУБЯК.**

Шахматы

У спаборніцтвах прыняло ўдзел пяць каманд. За кожную з іх выступалі па тры шахматысты. Пераможцамі выйшлі матэматыкі. Яны набралі 9 ачкоў. Шахматысты геолага-геаграфічнага факультэта і факультэта фізічнай культуры набралі па шэсць ачкоў і падзялілі другое і трэцяе месцы. На рахунку эканомфака 5,5 ачка і 4 месца. Замкнулі турнірную табліцу супрацоўнікі біяфака, якія набралі 3,5 ачка.

На першай дошцы лепшы вынік -- 3,5 ачка з чатырох магчымых -- паказаў В.Караткевіч з матэматычнага факультэта. На другой дошцы мацнейшым аказаўся Ю.Кашын з названага факультэта. Ён, а таксама В.Харытошкін з факультэта фізічнай культуры, які выступаў на трэцяй дошцы, паказалі абсалютны вынік: па 4 ачкі з чатырох магчымых.

Папроку заслугоўваюць прафсаюзныя арганізацыі фізічнага, гісторыка-юрыдычнага і філалагічнага факультэтаў, якія не здолелі выставіць каманды на гэтыя спаборніцтвы. У прыватнасці, фізічны факультэт усе папярэднія гады быў у прызёрах. Моцныя шахматысты працуюць тут і цяпер.

**А.КОСЦІКАЎ,**
**галоўны сакратар спаборніцтваў.**

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб"яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

-- гісторыі Беларусі -- асістэнта;
-- беларускай літаратуры -- дацэнта;
-- матэматычнага аналізу -- дацэнта;
-- аўтаматызаваных сістэм апрацоўкі інфармацыі -- дацэнта;
-- тэорыі і методыкі фізічнай культуры -- ст. выкладчыка;
-- фізвыхавання -- ст. выкладчыка.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней 1 месяца з дня апублікавання. Заявы накіроўваць на адрас: 246699 г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

# СТУДЭНТЫ ДЭМАНСТРУЮЦЬ СІЛУ

У Рэчыцы прайшоў чэмпіяната вобласці па армрэстлінгу /барацьба на руках/, дзе за каманду Цэнтральнага раёна выступалі нашы студэнты.

У вагавай катэгорыі да 70 кг трэцякурснік фізічнага факультэта Іван Пашэда левай рукой паклаў усіх сваіх прэтэндэнтаў і заняў І-е месца. Не адстаў ад Івана і Сяргей Касілкін /5 курс фізічнага факультэта/, які перамог правай рукой у вагавай катэгорыі да 90 кг. Студэнты-фізікі ўпершыню выканалі нарматыў кандыдата ў майстры спорту Рэспублікі Беларусь.

Ігар Коўгар -- 3 курс геолага-геаграфічнага факультэта -- у вагавай катэгорыі да 60 кг заняў правай рукой другое месца.

Нагадаю, што нашых спартсменаў трэніруе выкладчык кафедры фізвыхавання Сяргей Барысавіч Пірагоў.

Наперадзе рэспубліканскія спаборніцтвы.

**В.МАРЧАНКА.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат філалагічнага факультэта, калектыў кафедры рускай літаратуры выказваюць глыбокае спачуванне аспіранту названай кафедры **БЕСЯЦКАМУ** Паўлу Пятровічу з выпадку напаткаўшага яго гора -- смерці **МАЦІ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат біялагічнага факультэта, калектыў кафедры заалогіі і аховы прыроды выказваюць глыбокае спачуванне намесніку дэкана біяфака **ТАЛКАЧОВУ** Васілю Іванавічу з выпадку напаткаўшага яго гора -- смерці **МАЦІ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў факультэта фізічнай культуры выказваюць глыбокае спачуванне ст. выкладчыку кафедры тэорыі і методыкі фізічнай культуры **КУЛІКОВУ** Аляксандру Іванавічу ў сувязі з напаткаўшым яго горам -- смерцю **МАЦІ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 221
Спонсары газеты -- НВП "Сучасныя тэхналогіі", прафком студэнтаў.

Газета набрана і звёрстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана ў інфармацыйна-вылічальным цэнтры ВА "Беларуснафта".

Рэдактар
Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ
Падпісана да друку 19.02.96.